# І ГОНАР, І АДКАЗНАСЦЬ

## З ЖЫЦЦЁВЫМ І ПРАФЕСІЙНЫМ ДОСВЕДАМ

### Ад дэпутацкага корпуса Брэстчыны выбраны 52 дэлегаты УНС

**На сесіі Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў у якасці дэлегатаў УНС выбралі 52 прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса. У адпаведнасці з квотай дзесяць кандыдатур вылучалася ад абласнога Савета, 21 — ад раённых і гарадскіх Саветаў і 21 — ад сельскіх. Удзельнікі сесіі падтрымалі вылучаных кандыдатаў і прагаласавалі за іх выбранне дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу.**


Фота ZARYA.BY

У размове з журналістамі **старшыня Брэсцкага аблсавета Ігар БРЫЛЕВІЧ** адзначыў, што гэтыя людзі маюць падтрымку сваіх выбаршчыкаў, за іх грамадзяне аддалі свае галасы падчас адзінага дня галасавання: «Важна, што дэлегаты прадстаўляюць абсалютна ўсе галіны народнай гаспадаркі, валодаюць кампетэнцыямі і кваліфікацыямі, каб аб'ектыўна прымаць рашэнні найвышэйшага ўзроўню».

Абсалютная большасць дэлегатаў — людзі з вялікім жыццёвым досведам, прафесіяналы сваёй справы. Такія, напрыклад, як **Мікалай ШЫКАЛАЙ, старшыня вытворчага кааператыва «Моталь»** з Іванаўскага раёна, якога вылучылі ад сельскага Савета. Мікалай Сцяпанавіч — чалавек вядомы не толькі на сваёй малой радзіме, але і ў раёне, вобласці. Падчас прадстаўлення кандыдата па відэасувязі **старшыня Мотальскага сельвыканкама Этэры ПТАШЫЦ** сказала: «Мікалай Шыкалай прысвяціў жыццё роднаму Моталю, некалькі разоў выбіраўся дэпутатам раённага Савета, тры разы — абласнога, нязменны дэпутат сельскага Савета. Мікалай Сцяпанавіч удастоены звання «Найлепшы прадпрымальнік года» ў вобласці, адзначаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу краіны. Ён развівае прыватны бізнес і не застаецца ў баку ад жыцця вёскі, пастаянна выступае спонсарам сацыяльнай сферы раёна, падтрымлівае ініцыятывы па развіцці тэрыторыі. З яго ўдзелам і ўсебаковай падтрымкай праходзіць вядомы на ўсёй краіне фестываль «Мотальскія прысмакі». І галоўнае, што ён хварэе душой за родныя мясціны».

«Для мяне самая высокая ўзнагарода — падтрымка маіх землякоў, — адзначае Мікалай Шыкалай. — Спадзяюся, што мой жыццёвы і вытворчы досвед будуць карысныя ў справе прыняцця важных рашэнняў. Гатовы адстойваць інтарэсы сельскіх тэрыторый і малых населеных пунктаў».

**Людміла МАРОЗ, дырэктар Столінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва** і ў сваёй асноўнай, і ў грамадскай — на пасадзе старшыні раённай арганізацыі БСЖ — і ў дэпутацкай дзейнасці адстойвае інтарэсы шматдзетных сем'яў, тым самым дбае пра дэмаграфічную бяспеку краіны. Людміла Васільеўна праблему ведае знутры, яна маці пяці сыноў. Дэлегат УНС лічыць, што пытанне дэмаграфічнай бяспекі павінна быць заўсёды на парадку дня вышэйшага органа народаўладдзя. «Буду прыкладваць усе намаганні для таго, каб шматдзетнасць у нашай краіне станавілася традыцыйнай, моднай».

**Начальнік Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групы імя Ф. Э. Дзяржынскага Максім БУТРАНЕЦ**, які быў вылучаны кандыдатам у дэлегаты ад Брэсцкага гарадскога Савета, перакананы, што тэма бяспекі, захавання суверэнітэту, стабільнага развіцця краіны стане адной з прыярытэтных для народнага веча. «Сёння важна фарміраваць пояс добрасуседства, але пры гэтым забяспечваць нацыянальныя інтарэсы па дзяржаўнай мяжы і ў памежжы», — падкрэсліў Максім Бутранец.

**Прадстаўнік працуючай моладзі Пінскага раёна Уладзімір РАПІНЧУК** мае намер узняць пытанне далейшай актывізацыі маладзёжнага руху. Уладзімір працуе намеснікам дырэктара Высокаўскай сярэдняй школы імя Дняпроўскай флатыліі. «Для мяне вялікі гонар прымаць удзел у распрацоўцы стратэгічных кірункаў развіцця грамадства, — сказаў дэлегат УНС. — З'яўляюся членам Маладзёжнага савета пры Цэнтральнай выбарчай камісіі. Маю намер выкарыстоўваць свой досвед у рабоце з моладдзю для выхавання актыўнай грамадзянскасці ў падрастаючага пакалення. Падзялюся напрацоўкамі нашай установы адукацыі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## «МЫ ВЕДАЕМ, ШТО ТРЭБА ЛЮДЗЯМ У РЭГІЁНАХ»

**На пасяджэнні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 29-га склікання адбыліся выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Мінскай вобласці.**

Кандыдатамі ў дэлегаты УНС ад мясцовых Саветаў дэпутатаў былі вылучаны 60 чалавек: 12 чалавек ад Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і 48 чалавек ад Саветаў дэпутатаў базавага і першаснага ўзроўняў. Падчас адкрытага галасавання дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў падтрымалі ўсе 60 кандыдатур.

Дэлегаты УНС ад Мінскай вобласці прадстаўляюць усе сферы эканомікі. Сярод іх — дзеячы культуры і мастацтва, урачы, настаўнікі, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў і іншыя. Самаму маладому дэлегату ўсяго 24 гады. Гэта дэпутат Карына Лоўчая, якая працуе эканамістам у сельскай гаспадарцы. Яна прадставіць на народным вечы Лагойскі раён.

«Усебеларускі народны сход з'яўляецца канстытуцыйным органам, і вы на працягу пяці гадоў будзеце дэлегатамі УНС, прымаючы рашэнні па найважнейшых пытаннях, звязаных з развіццём нашай краіны. Таму хацеў бы вас прасіць, каб вы данеслі сваім калектывам тыя рашэнні, якія будуць прыняты, тую атмасферу, якая панавала на сходзе. Вы прадстаўляеце ўсе пласты, і, як кажа Прэзідэнт, УНС — гэта народнае веча, якое вызначае лёс нашай краіны. Гэта велізарны гонар і велізарная адказнасць. Калі мы ўсе разам будзем рухацца наперад, то любыя задачы і рашэнні нам будуць па плячы», — падкрэсліў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**, які прысутнічаў на пасяджэнні аблсавета.

Пасля пасяджэння дэлегаты Усебеларускага народнага сходу падзяліліся тым, з якім настроем і з якімі задачамі яны адпраўяцца на народны форум.

«Місія адказная. На УНС я буду прадстаўляць сферу аховы здароўя, таму мяне хвалюе развіццё галіны, у прыватнасці якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі насельніцтву. Таксама лічу, што дэлегат павінен быць актыўным патрыётам і паказваць актыўную пазіцыю грамадзяніна. Я з'яўляюся прадстаўніком Маладзёжнага савета, таму буду праяўляць ініцыятыву яшчэ і ў гэтым плане. У Бярэзінскім раёне шмат робіцца для моладзі, але хацелася б больш актыўнага будаўніцтва жылля для маладых спецыялістаў з мэтай замацавання на рабочых месцах. Усё для таго, каб моладзь прыязджала і заставалася актыўнымі жыхарамі нашага раёна», — расказала **Крысціна КРУК, дэпутат Бярэзінскага раённага Савета дэпутатаў, галоўны ўрач Бярэзінскай ЦРБ**.



«Для мяне выбранне дэлегатам УНС — гэта вялікі давер дэпутатаў. На дэлегатаў ускладаецца вялікая адказнасць, бо УНС набыў новы статус пасля рэферэндуму і задач перад ім стаіць шмат. Гэта і зацвярджэнне ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, і ваеннай дактрыны, і канцэпцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Паспрабую дух сходу несці ў масы і рэалізоўваць у сваёй паўсядзённай рабоце. Улічваючы мой досвед, я ведаю, што трэба людзям у рэгіёнах. Гэта і стварэнне новых рабочых месцаў, і павышэнне дабрабыту жыхароў, і прыцягненне інвестыцый. Усё гэта дазволіць вырашаць і сацыяльныя пытанні, і праблемы ЖКГ», — падзяліўся **Аляксандр КОНЧАНКА, дэпутат Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў, дырэктар Пухавіцкага доследнага эксперыментальнага завода**.

**Паводле БелТА.**

## ПАТРЫЯТЫЗМ — РУХАВІК БУДУЧЫНІ

**На трэцяй пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў выбралі 44 дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў паўночнага рэгіёна.**

У лік дэлегатаў увайшлі прадстаўнікі розных сфер — адукацыі, прамысловасці, аховы здароўя, прыватнага бізнесу, сацыяльнай сферы. «Гэтыя людзі досыць шырока вядомыя ў сваім прафесійным асяроддзі і рэгіёнах, валодаюць заслужаным аўтарытэтам, бо дасягнулі пэўных вынікаў у прафесійнай дзейнасці і пры гэтым валодаюць актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Яны максімальна ўцягнутыя ў грамадскія працэсы ў сваіх населеных пунктах. Такі сплаў патрыятызму і прафесіяналізму, неабыякавасці да палітычных працэсаў у краіне, актыўнай грамадзянскай пазіцыі стаў ключавым фактарам, які паўплываў на рашэнне даверыць прадстаўляць менавіта гэтым дэлегатам інтарэсы шырокай грамадскасці Віцебскай вобласці», — адзначыў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ**.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны падкрэсліў, што дэлегаты на УНС будуць сканцэнтраваныя не на мясцовых пытаннях, што датычацца дарог і ЖКГ, якія павінны вырашаць мясцовай уладай, а зоймуцца прапрацоўкай больш глабальных тэм. «УНС будзе з'яўляцца органам, які вызначае ключавыя кірункі як сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, так і пытанні міратворчасці, займацца ўмацаваннем нацыянальнай бяспекі».

На Усебеларускі народны сход ад паўночнага рэгіёна выбралі дзевяць дэлегатаў ад абласнога Савета дэпутатаў, 18 — ад базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, 17 — ад першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

У ліку тых, хто будзе прадстаўляць Віцебшчыну, — **настаўнік Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў Аляксандр МІХНО**. Ён адзначыў, што разам з забеспячэннем пытанняў бяспекі важна звяртаць пільную ўвагу на патрыятычнае выхаванне моладзі. «Падзеі 2020 года паказалі, як важна не прамінаць гэтае пытанне, фарміраваць выразныя маральныя і грамадзянскія арыенціры ў душах дзяцей, каб ніхто не змог паўплываць на іх розумы і такім чынам знішчыць нашу краіну. У цяперашні час гэтаму пытанню аддаецца вялікая ўвага на самым высокім дзяржаўным узроўні. І зніжаць гэтую планку нельга. Мір — гэта падмурак будучыні нашых дзяцей, іх магчымасці ўпэўнена будаваць нашу краіну далей. Але і яны павінны расці патрыётамі, якія ўсведамляюць значнасць гэтага асноватворнага моманту для кожнага народа».

**Старшыня Асвейскага сельскага Савета Верхнядзвінскага раёна Сяргей НАВІЦКІ** таксама адзначыў, што жыхары Верхнядзвіншчыны, якая мяжуе з Латвіяй, як ніхто ў свеце сусветных падзей, усведамляюць каштоўнасць незалежнасці і спакою нашай краіны. Сяргей Уладзіміравіч нагадаў моманты жорсткіх гістарычных урокаў, якія не змаглі зламаць адзінства беларусаў. «Сёлета рашэннем Прэзідэнта Беларусі наш гарадскі пасёлак Асвея ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Тады, падчас нямецкай карнай аперацыі «Зімовае чараўніцтва», якая закранула тэрыторыю некалькіх раёнаў, загінулі тысячы мірных жыхароў. Сотні населеных пунктаў фашысты спалілі, каб утварыць 40-кіламетровую паласу мёртвай зямлі. Нашы людзі памятаюць горкія старонкі гісторыі сваёй краіны і ўсімі сіламі заўсёды будуць імкнуцца захаваць за Беларуссю статус мірнай і стваральнай дзяржавы. Што б ні адбывалася навокал, мы спакойна жывём, будуем жыллё, гадуем дзяцей, добраўпарадкоўваем свае тэрыторыі, ходзім на работу. Усё гэта — каштоўнасць, якую ўсім нам трэба захаваць. Таму гэтаму пытанню я маю намер аддаць самую пільную ўвагу ў сваёй рабоце», — падкрэсліў дэлегат.

Дэлегаты паабяцалі, што, акрамя пытанняў патрыятычнага выхавання моладзі, на Усебеларускім народным сходзе будуць працаваць над паляпшэннем сістэмы адукацыі, аховы здароўя, прывіццём агульначалавечых і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, над развіццём прамысловага, культурнага і турыстычнага патэнцыялу краіны.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**